■ Падзея

# ПА ДУХОЎНУЮ СПАДЧЫНУ

Запрашае чытачоў газета «Звязда» разам са сваім фотакарэспандэнтам Яўгенам Пясецкім

**Як гэта было ў папярэдніх экспедыцыях, удзельнікам міжнароднай навукова-асветніцкай экспедыцыі «Дарога да святыняў» будзе прадстаўнік «Звязды». Усе гады газета падрабязна асвятляла працу гэтых унікальных паломніцтваў, падобных якім няма ў іншых краінах.**

Асаблівасць шматдзённага навукова-асветніцкага маршруту ў тым, што разам са святарамі Беларускай Праваслаўнай Царквы ў дарогу адпраўляюцца вядомыя гісторыкі, літаратары, акцёры, мастакі, музыканты. Іх агульная мэта — пабываць у розных гарадах і вёсках Беларусі, сустрэцца і выступіць перад тымі, хто жадае ведаць больш пра нашу духоўную спадчыну, у сумесным набажэнстве памянуць продкаў і памаліцца за наш заўтрашні дзень. Кульмінацыяй такіх сустрэч становіцца малітоўная перадача ўсім прысутным Дабрадатнага агню ад Гроба Гасподняга ў Іерусаліме. Тысячы свечак запальваюць жыхары гарадоў і вёсак ад прынесенай экспедыцыяй лампады з гэтым агнём.

**2 верасня** ўдзельнікі экспедыцыі прымуць удзел у малебне на Святым полі пад Баранавічамі, правядуць навукова-асветніцкія сустрэчы з жыхарамі Баранавіч і Івацэвіч.

**3 верасня** адбудуцца хрэсныя ходы, пасадка Саду малітвы, сустрэчы са школьнікамі ў Івацэвіцкім і Бярозаўскім раёнах.

**4 верасня** лампаду з Дабрадатным агнём экспедыцыя даставіць у Пружаны, Свіслач, Гродна, дзе таксама пройдуць сумесныя набажэнствы і сустрэчы з жыхарамі.

**5 верасня** пачнецца з пасадкі Саду малітвы ў Гродне, набажэнстваў у Верцялішках і Скідзелі. У гэты ж дзень экспедыцыю, якая нясе з сабой цудатворную Загор'е-Сталавіцкую ікону, урачыста сустрэнуць у Шчучыне — сёлетняй сталіцы Дня беларускага пісьменства.

**6 верасня** паломнікі навукова-асветніцкага маршруту будуць удзельнічаць у Божай літургіі і мерапрыемствах Дня беларускага пісьменства.

Як заўжды, наша газета будзе інфармаваць сваіх чытачоў пра цікавыя сустрэчы на шляху экспедыцыі, пра новае, што даведаюцца паломнікі з гісторыі роднага краю. На сустрэчах з жыхарамі будуць праходзіць экспрэс-прэзентацыі фотавыставы Яўгена Пясецкага пра работу экспедыцыі ў Беларусі і яго фотазамалёўкі са святой зямлі Іерусаліма.



Яўгена Пясецкага
Фота слова

**Гэтыя фотаздымкі, зробленыя ў час леташняй экспедыцыі, нагадваюць пра шлях экспедыцыі па полі мінулых баёў каля вёскі Сталовічы і агульнае набажэнства ў мясцовай праваслаўнай царкве. На пярэднім плане каля званоў удзельнік экспедыцыі — паэт, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь Міхась БАШЛАКОЎ.**



*Крані, паэт, званы —*
*Няхай гучаць яны.*
*Каб чулі ад Прыдзвіння*
*да Палесся.*
*Хай покліч даўніны*
*І новае вясны*
*У гэтых галасах*
*сальюцца цесна.*
*Званоў тваёй зямлі,*
*Адолець не змаглі —*
*Яны чужыя песні*
*не спяваюць.*
*Стагоддзі*
*прэч плывуць,*
*Але званы жывуць*
*І родны край*
*прад небам услаўляюць.*

## СЁННЯ

### Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 6.17 | 20.01 | 13.44 |
| Віцебск — | 6.04 | 19.53 | 13.49 |
| Магілёў — | 6.07 | 19.51 | 13.44 |
| Гомель — | 6.06 | 19.45 | 13.39 |
| Гродна — | 6.32 | 20.16 | 13.44 |
| Брэст — | 6.36 | 20.13 | 13.37 |

### Месяц

*Поўня 29 жніўня.*
*Месяц у сузор'і Авена.*

### Імяніны

**Пр.** *Андрэя, Мікалая, Цімафея.*
**К.** *Браніславы.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЗАЎТРА




Даты | Падзеі | Людзі

### 1 ВЕРАСНЯ

**1935** год — 80 гадоў таму данбаскі шахцёр Аляксей Стаханаў перавысіў сутачную норму вуглездабычы ў 14 разоў, што паслужыла пачаткам «стаханаўскага руху» ў СССР. У снежні 1935 года пленум ЦК ВКП (б) пастанавіў пераўтварыць «стаханаўскі рух» у рух мільёнаў. Ён стаў асноўнай формай сацыялістычнага спаборніцтва і хутка ахапіў усю краіну. Ужо праз некалькі месяцаў амаль на кожным савецкім прадпрыемстве з'явіліся свае стаханаўцы. Рабочыя самі імкнуліся ў перадавікі. Адны з ідэйных меркаванняў, іншыя — дзеля льгот і ўзнагарод. У 1936 годзе па ініцыятыве прафсаюзаў сталі стварацца школы стаханаўскага вопыту. У асобных галінах прамысловасці стаханаўцы складалі ад 20 да 27 працэнтаў усіх працоўных. Актыўна праводзіліся стаханаўскія змены, дні, пяцідзёнкі, дэкады, месяцы, у якіх удзельнічалі цэлыя прадпрыемствы. «Рэкорды» ў многіх выпадках ствараліся штучна. Пры гэтым нікога не цікавілі ні тэхнічныя нормы, ні тэхніка бяспекі, ні якасць прадукцыі. У 1939 годзе ўлады абвясцілі «стаханаўскі рух» сведчаннем сталасці працоўнага класа. Аднак у сваім арыгінальным выглядзе ён у краіне так і не прыжыўся.

**1900** год — нарадзіўся (вёска Рудкова, цяпер Уздзенскі раён) Сымон Баранавых, беларускі пісьменнік. Аўтар зборніка прозы «Злоба», рамана «Калі ўзыходзіла сонца», а таксама аповесцей для дзяцей. Асноўная тэма творчасці — класавая барацьба ў беларускай вёсцы ў першыя гады савецкай улады, калектывізацыя. У 1936 годзе быў арыштаваны і асуджаны на 10 гадоў пазбаўлення волі. Памёр у 1942-м. Рэабілітаваны пасмяротна ў 1954 годзе.

**1939** год — пачаліся вайсковыя палігонныя выпрабаванні першай у свеце рэактыўнай сістэмы залпавага агню БМ-13 «Кацюша». У той жа дзень Вярхоўны Савет СССР прыняў Закон «Аб усеагульным воінскім абавязку». Закон замацоўваў пераход да кадравай сістэмы камплектавання савецкіх Узброеных Сіл.



### Было сказана

**Алесь ЗВОНАК, паэт:**

*Вер часу: глупства мудрых не скасіла,*
*Са сцежкі яснай зайздрасць не звяла.*

## УСМІХНЕМСЯ

**Жаночае.**

**Праклятая дыета! Стаяла ў аўтобусе побач з мужыком, ад якога пахла смажанай бульбай... Не вытрымала і ўкусіла яго!**

— Мне патрэбны нябіткія талеркі, кубкі, лыжкі, але і каб не бразгаталі.

— Навошта?

— Не люблю мыць посуд.

— Купіце пасудамыйную машыну.

— Навошта, у мяне ёсць пральная.

**Фразы для гасцей кшталту «А цяпер я пакажу вам наш сямейны альбом!» альбо «Паглядзіце, як вучыцца наш сын!» значна эканомяць прадукты і выпіўку.**




caricatura.ru

Віншуем
**ДЗІМІТРЫЯ ГУШЧЫНСКАГА**
з цудоўнай падзеяй — нараджэннем дачушкі!
*Хай дзяўчынка будзе самай прыгожай, таленавітай, вясёлай і здаровай — на радасць бацькам. Хай наперадзе яе чакае яркі і радасны свет, у якім ёй будзе ўтульна жыць; хай пяшчотныя рукі мамы і моцнае плячо таты дапамогуць справіцца з любымі перашкодамі ў жыцці, падтрымаюць і сагрэюць!..*



**Звяздоўцы.**

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.
Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, 287 17 21, бухгалтэрыі: 287 18 81.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.
http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by
ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by
Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.022. Індэкс 63850. Зак. № 3384.
Нумар падпісаны ў 19.30 31 жніўня 2015 года.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12